А.АЛЕКСАНДРОВІЧ

# З ГУЧНЫМІ БАДЗЁРЫМІ ПЕСНЯМІ - НАПЕРАД!

Беларусь у барацьбе за існаванне ўлады саветаў, Савецкая Беларусь,будуючы новы лад жыцця рабочых і сялян, выхоўвала маладых барацьбітоў за вольнасць сваёй краіны, загартоўвала будаўнікоў маладой дзяржавы, чорнарабочых вялікага будаўніцтва.

Адным з гэтых атрадаў будаўнікоў і з"явілася Усебеларускае Аб"яднанне паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк".

Невялічкая група, якая ўзяла на сябе ініцыятыву і надалей адказную перад працоўнымі гушчамі Беларусі, працу, поўнасцю ажыццявіла свае заданні, даказала сваю працаздольнасць.

Мы бачым вялікі рост маладнякоўскіх шэрагаў за два гады.

28 лістапада 1923 году было першае арганізацыінае пасяджэнне (у Мінску, у клубе КІМ"а), на якім было толькі шэсць таварышоў; цяпер мы ў сваіх радах налічваем каля пяцісот сяброў.

У кожнай акрузе ёсць свае філіі (аддзяленні), маем іх нават і ў некаторых раёнах.

Школы, хаты-чытальні прымаюць на сваіх агульных сходах імя "Маладняка".

Гэта сведчыць аб жыццёвасці арганізацыі, гэта сведчыць, што "Маладняк" працоўныя масы прынялі і разам з ім будуць будаваць новы лад жыцця, новую пралетарскую культуру.

Мы творым, мы імкнемся пабудаваць сацыялізм у пераважна сялянскай краіне, творым яго ў перыяд, калі ў нас гаспадарыць савецкі парадак, але пад упартым кіраўніцтвам дыктатуры пралетарыяту мы гэтага дасягнем.

"Маладняк" павінен сваімі мастацкімі вобразамі акрынічыць наша жыццё дынамікай сацыялістычнага пабудавання.

"Маладняк" зразумеў шлях, па якому ён павінен ісці, прыняўшы кіраўніцтва перадавога класа, перадавіка рэвалюцыі - рабочага, які грае ў нашым жыцці роль правадыра сацыялізму.

"Маладняк" у сваіх творах павінен як мага шчыльней прыстасоўваць свае мэты да агульных мэт пралетарыяту.

Цяпер адбываецца першы ў Беларусі з"езд першага аб"яднання паэтаў і пісьменнікаў - "Маладняк".

З дакладаў і спрэчак, якія вынікаюць на з"ездзе, відавочна кожнаму аб узросце арганізацыі.

Але адна задача, якая павінна стаць галоўнай у маладняком маладнякоўскім жыцці, гэта вучоба і вучоба ленінская.

Працаваць у грамадзянскім жыцці нашай краіны, вывучаць гісторыю барацьбы рабочага класа, перавыхоўваць сваіх малодшых братоў, загартоўваючы ў іх пралетарскую ідэалогію, марксісцкі светапогляд - вось найлепшыя ўзоры ленінскай вучобы, якая павінна заняць належнае месца ў развіцці сілы "Маладняка".

Планавасць у арганізацыйнай працы, сістэматычнасць над узняццем свайго ўзроўню светапазнання - вось асноўнае ў далейшай працы "Маладняка".

З гучнымі, бадзёрымі, новымі песнямі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і нашага Ленінскага Камсамолу "Маладняк" стане за варстак пабудовы новага ладу жыцця.

"Чырвоная змена", 1925, 2-XП, № 80, с.2.